# Абаненты А1 у роўмінгу змогуць бясплатна званіць на «гарачыя лініі» беларускіх дыппрадстаўніцтваў

На перыяд дзеяння абмежавальных мер, якія прымаюцца рознымі дзяржавамі ў мэтах недапушчэння распаўсюджвання каронавіруснай інфекцыі COVID-19, А1 робіць бясплатнымі званкі на «гарачыя лініі» беларускіх дыпламатычных прадстаўніцтваў для абанентаў кампаніі, якія на гэты момант знаходзяцца ў 56 краінах свету ў роўмінгу.

Адпаведнае рашэнне было прынята кіраўніцтвам кампаніі А1 у супрацоўніцтве з МЗС Беларусі і заклікана забяспечыць неабходнай кансультацыйнай дапамогай тых грамадзян Беларусі, якія апынуліся за межамі краіны і адчуваюць складанасці з вяртаннем дадому з-за абмежаванняў на перасячэнне межаў, уведзеных рознымі дзяржавамі ў сувязі з пагрозай пандэміі COVID -19.

Пры звароце абанентаў А1 (у тым ліку тых, якія знаходзяцца ў роўмінгу) на «гарачыя лініі» дыпламатычных прадстаўніцтваў Рэспублікі Беларусь у такіх краінах, як Расія, Украіна, Польшча, Літва, Латвія, Эстонія, Ізраіль, ЗША, Вялікабрытанія, Францыя, Германія, ЗША і інш. тарыфікацыя выходных выклікаў, пачынаючы з 19 сакавіка, не робіцца. Абаненты А1, якія знаходзяцца на гэты момант за мяжой, будуць праінфармаваныя аб прадстаўленай кампаніяй магчымасці.

З поўным спісам краін, а таксама нумарамі дыпламатычных прадстаўніцтваў Рэспублікі Беларусь у кожнай з іх, можна азнаёміцца па спасылцы

---

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/20-03-2020-6119*